# Кандыдаты сталінскага блока комуністаў і беспартыйных

**В. І. КАЗЛОЎ**

Ад краю да краю, па ўсёй нашай неабдымнай краіне вялікі совецкі народ з велізарным уздымам і натхненнем рыхтуецца да радаснага і знамянальнага дня выбараў у Вярхоўны Совет СССР.

У гэтыя дні кожны совецкі патрыёт з асаблівай сілай перажывае свяшчэнныя пачуцці гордасці за сваю любімую Радзіму, якая стаіць на чале сіл міру і дэмакратыі, з'яўляецца сцяганосцам міру і прагрэса, маяком шчасця і надзеі для працоўнага чалавецтва ўсяго зямнога шара.

У гэтыя дні з нябачанай сілай праяўляецца маральна-палітычнае адзінства совецкага грамадства, бязмежная любоў і адданасць совецкіх людзей большэвіцкай партыі, свайму роднаму бацьку і мудраму праваднру Іосіфу Вісарыёнавічу Сталіну.

Совецкія людзі ведаюць, што усімі сваімі дасягненнямі, поспехамі яны абавязаны вялікай партыі Леніна — Сталіна. Па-майстэрску валодаючы законамі грамадскага развіцця, большэвіцкая партыя ў нябачана кароткі гістарычны тэрмін пераўтварыла нашу краіну з адсталай, эканамічна слабай у мінулым у самую перадавую краіну ва ўсім свеце, зрабіла яе магутнай і незалежнай.

Перад усім светам ярка раскрыліся вялікія перавагі совецкага грамадскага і дзяржаўнага ладу над ладам капіталізма. Гэтых пераваг не скрыць ад працоўных імперыялістычным драпежнікам ніякімі хітрыкамі, ніякай маной.

Совецкая краіна не ведае крызісаў; яе эканоміка няспынна расце, нябачанымі тэмпамі дасягае ўсё новых і новых поспехаў. Капіталістычны-ж свет кідаецца ў пошуках выхаду з усё больш нарастаючага эканамічнага крызіса, там адбываецца бесперапыннае падзенне ўзроўню прамысловай вытворчасці. За апошнія дваццаць год аб'ём прамысловай вытворчасці Совецкага Саюза павялічыўся ў 9 разоў, а прамысловая вытворчасць капіталістычнай Еўропы ў цэлым за гэтыя дваццаць год засталася на адным і тым-жа ўзроўні. У галоўнай краіне капіталізма, яго цытадэлі—ЗША—узровень прамысловай вытворчасці за год, з кастрычніка 1948 года па кастрычнік 1949 года, знізіўся на 22 проценты. У нашай-жа краіне павялічаны план на 1949 год выканан у цэлым па прамысловасці на 103 проценты. Аб'ём усёй прамысловай прадукцыі ў СССР у 1949 годзе перавысіў вытворчасць даваеннага 1940 года на 41 процант, а агульны ўзровень прамысловай вытворчасці ў чацвертым квартале 1949 года перавысіў даваенны ўзровень на 53 проценты.

Дасягнут даваенны ўзровень прамысловай вытворчасці ў раёнах, якія падвяргаліся нямецка-фашысцкай акупацыі.

Выдатных поспехаў дасягнула наша соцыялістычнае земляробства. Валавая прадукцыя соцыялістычнай сельскай гаспадаркі ў цэлым перавысіла ў 1949 годзе ўзровень даваеннага 1940 года. У сельскай гаспадарцы ўжо вырашана зернавая праблема—валавы ўраджай зернавых культур склаў 7,6 мільярда пудоў, перавысіўшы ўзровень даваеннага 1940 года, і амаль дасягнуў узроўню, устаноўленага пяцігадовым планам на 1950 год.

На фоне разлагаючайся, гніючай буржуазнай культуры асабліва

ПРЭЗІДЭНЦКАЯ БІБЛІЯТЭКА РЭСПУБЛІКІ БЕЛАРУСЬ

здзіўляючы поспехі совецкай социялістычнай культуры. У нашай краіне ў пачатковых, сямігадовых і сярэдніх школах, тэхнікумах і іншых спецыяльных навучальных установах навучаецца звыш 36 мільёнаў чалавек. Толькі ў вышэйшых навучальных установах краіны вучыцца 1.128 тысяч чалавек. Гэта перавышае на 316 тысяч чалавек даваенную колькасць студэнтаў. Нябачанага росквіту дасягнулі ў нашай краіне нацыянальныя па форме, соцыялістычныя па зместу літаратура і мастацтва.

У гэтых выдатных выніках ярка адлюстроўваецца перавага совецкай соцыялістычнай сістэмы над прагніўшай і паміраючай сістэмай капіталізма. Цяпер ужо ўсё перадавое чалавецтва бачыць, што капіталізм з'яўляецца нецярпімым тормазам на шляху далейшага развіцця чалавечага грамадства, што век капіталізма прыходзіць к канцу, што ўсе дарогі вядуць да комунізма.

Кастрычніцкая соцыялістычная рэволюцыя разбіла ў нашай краіне ланцугі капіталістычнага рабства і зрабіла працоўных гаспадарамі свайго лёсу, прынесла ім сапраўдную свабоду і роўнасць, прадаставіла усе магчымасці для будаўніцтва новага, соцыялістычнага жыцця.

Упершыню ў гісторыі былі створаны і матэрыяльныя ўмовы для заможнага і культурнага жыцця працоўных. «Наша рэволюцыя з'яўляецца адзінай, якая не толькі разбіла аковы капіталізма і дала народу свабоду, але паспела яшчэ даць народу матэрыяльныя ўмовы для заможнага жыцця. У гэтым сіла і непераможнасць нашай рэволюцыі». [1]

Совецкі народ даўно забыўся, што такое беспрацоўе. Увесь нацыянальны даход нашай краіны размяркоўваецца ў інтарэсах працоўных. У нас бесперапынна расце рэальная заработная плата рабочых і служачых. Калгасны лад вызваліў сялянства нашай краіны ад жахаў галечы і разарэння, даў магчымасць у кароткі тэрмін ліквідаваць спрадвечную адсталасць вёскі і адкрыў шлях сялянству да заможнага і культурнага жыцця. Перад працоўнымі нашай краіны шырока адкрыты шляхі да авалодання навукай, ведамі.

Няўхільны ўздым добрабыту і культуры народа з'яўляецца законам развіцця соцыялістычнага грамадства.

Зусім адваротную карціну бачым мы ў капіталістычным грамадстве. Аснаваны на звярыным законе эксплаатацыі працоўных, капіталістычны лад кіруецца ў адносінах да чалавека толькі адным—выкалачваннем прыбытку.

Больш ста год таму назад вялікія асновапаложнікі рэволюцыйнага марксізма Маркс і Энгельс з гневам пісалі, што капіталізм, выдзяляючы з усіх сваіх пораў кроў і бруд, растаптаў асабістыя годнасці чалавека, патапіў у ледзяной вадзе эгаістычнага разліку ўсе яго высокія парывы і пачуцці, ператварыў гэтыя годнасці ў менавую вартасць, падпарадкаваў іх бессардэчнаму закону чыстагана.

Знаходзячыся ў сваёй апошняй стадыі здыхання, імкнучыся смуродам свайго гніцця атруціць увесь свет, сучасны капіталізм да крайніх межаў узмацніў гэтыя воўчыя драпежніцкія законы. Дзеля нажывы ён не спыняецца ні перад якімі самымі гнуснымі злачынствамі. Дзеля прыбыткаў капіталізм гатоў затапіць увесь свет у крыві новай вайны.

ПРЭЗІДЭНЦКАЯ БІБЛІЯТЭКА РЭСПУБЛІКІ БЕЛАРУСЬ

З поўным тэкстам дакумента можна азнаёміцца ў бібліятэцы